*Іна Блусянкова*

# ПРАБЛЕМА МОВЫ І КУЛЬТУРЫ КАРАІМАЎ ЯК ЗНІКАЮЧАГА ЭТНАСА

Дваццатае стагоддзе з яго войнамі і сацыяльнымі наступствамі, глабалізацыйнымі працэсамі нанесла ўдар па малых народах і паставіла іх на мяжу поўнага знікнення. Так, караімы занесены ў Чырвоную Кнігу ААН як адзін з самых малалікіх народаў на планеце. Даследчык С. М. Шапшал адзначае, што да канца XIX ст. ва ўсім свеце налічвалася не больш 16 тысяч караімаў; агульная колькасць іх у Расіі ў 1910 г. складала 12 тысяч, а па перапісе 1989 г. – 2803 чал. У наш час налічваецца каля 2000 крымскіх караімаў; на Ўкраіне пражывае 1100 чал. [5, *7*]. Караімскія суполкі сустракаюцца ў Літве (0,01% ад усяго насельніцтва) і Польшчы.

Як і калі караімы трапілі на тэрыторыю ВКЛ, дакладна вядома з гістарычных крыніц. У Вялікім княстве Літоўскім караімы згуртаваліся ў 1397–1398 гг., калі князь літоўскі Вітаўт Вялікі пасля паходу ў Крым прывёў адтуль некалькі соцен караімскіх і татарскіх сем'яў. Палонныя былі паселены ў Троках (каля Вільнюса), у Луцку, у Галічы і каля Львова. У народных казках, легендах захавалася павага да «Ватат-бію» – князя Вітаўта, да адважных і мудрых продкаў сучасных літоўскіх караімаў, якія служылі ў княжым замку на возеры Гальве і займалі там высокія дзяржаўныя пасады [6]. На Беларусі цяпер сустракаюцца толькі адзінкі гэтага знікаючага народа.

Слова «караім» мае два значэнні – паняцці рэлігіі і народнасці. Караімы (літаральна – людзі Пісання) – секта, якая ўзнікла ў пачатку VIII ст. у Багдадзе з цюркскіх плямёнаў Хазарскага каганата, якія прынялі караізм. Яе дактрына заснаваная на звароце да Біблії як адзінага кіраўніцтва ў паўсядзённым жыцці, пошуках у Пісанні ўтоеных указанняў на блізкі канец свету. У VI–VII ст. караімы ўтварылі ва Ўсходняй Еўропе магутную дзяржаву, якая займала тэрыторыю Прыкаспійскіх, Прычарнаморскіх стэпаў і Крым. У перыяд росквіту хазарскай магутнасці шэраг народаў Усходняй і Цэнтральнай Еўропы быў у іх падначаленні і плаціў даніну.

Крымскія караімы з'яўляюцца нашчадкамі хазарскай культуры і цюркскіх традыцый. У мінулым караімы – жывёлаводы, вінаградары, садоўнікі, рамеснікі, гандляры, ваяры. Заняткі народа адлюстроўвалі прозвішчы: напрыклад, *Байрактар* – сцяганосец, *Сарач* – шорнік, *Койчу* – чабан, *Арабаджы* – вознік, *Таббах* – гарбар, *Аттар* – аптэкар і інш. Знешне яны падобныя да хазар: цемнавалосыя, з чорнымі вачыма, смуглай скурай, з густым валасяным покрывам, сярэдняга росту, каржакаватыя. Цікавай з'яўляецца і караімская мова, якая, як лічыць даследчык У. Аляксееў, адносіцца да кыпчакскай групы цюркскіх моў. Па фанетычных, граматычных і лексічных асаблівасцях яна блізкая да адной з найстаражытнейшых цюркскіх моў – палавецкай, а з сучасных – да кумыцкай, карачаева-балкарскай, крымска-татарскай і іншых кыпчакскіх моў [1, *77*]. Даледчык Ю. А. Палканаў адзначае, што, пачынаючы з XX ст., для запісу караімскага

тэксту выкарыстоўваецца караімскі алфавіт, заснаваны на рускім алфавіце. Ён адрозніваецца ад апошняга наяўнасцю дадатковых літар *аб*, *у* (з умляўтам) і адсутнасцю літар *е*, *щ*, часта для цвёрдага вымаўлення зычных ужываецца цвёрды знак (ъ).

Важнай падзеяй у моўнай культуры з'явілася выданне акадэмічнага «Караімска-руска-польскага слоўніка» на 17400 слоў (пад рэдакцыяй Н. Баскакава, А. Зайанчоўскага, З. Шапшала) у 1974 г. і «Нарыса граматыкі караімскай мовы (крымскі дыялект)» – у 1976 годзе [4, *36*].

Традыцыйна-бытавая культура крымскіх караімаў – гэта своеасаблівае спалучэнне іудзейскіх і мусульманскіх (татарскіх, хазарскіх) традыцый. Караімскія хаты будаваліся ў вызначаным усходнім стылі. Абавязковай іх прыналежнасцю былі два падворкі: белы – са склепам, студняй, альтанкай, абвітай вінаграднікам, і чорны, прызначаны для свойскай жывёлы. Характэрнай рысай жылля была наяўнасць печы (тандура), размешчанай пасярод пакоя. У тандурах пяклі хлеб, ляпёшкі, гатавалі ежу, а ўзімку грэліся, пасеўшы вакол іх. У шматлікіх хатах меліся парадныя пакоі, у якіх захоўваліся куфры з вопраткай, тканінамі і кухонным посудам [7]. Даследчыкі адзначаюць, што жыццё караімак падобнае да жыцця мусульманак, таму што адасобленае ад усіх. На ўрачыстасцях жанчыны знаходзіліся асобна ад мужчын, нявеста не паказвалася перад сваім жаніхом аж да самога вяселля. І ўсё ж, у параўнанні з мусульманкамі, караімкі карысталіся большай воляй, мелі права голасу на радзе Джамата (суполкі) і да іх слоў прыслухоўваліся. У адной з караімскіх легенд гаворыцца аб жанчыне Шастак-Апай, па радзе якой Джамат, каб абараніць крэпасць, выпусціў кошыкі з пчоламі на галовы ворагаў. Так пчолы выратавалі старажытную крэпасць Кырк-Йэр [2, *16*].

Нацыянальныя асаблівасці выяўляюцца і ў караімскай кухні, якая заўсёды славілася сваімі стравамі і шырока вядома за межамі Крыма. Гэта, напрыклад, знакамітыя караімскія піражкі «эт айакълакъ», пірог з сырога мяса «кобэтэ», «чыр-чыр» – чабурэкі; «хамурдолма» – мініяцюрныя, памерамі з напарстак, пяльмені; «сарма» – галубцы з вінаграднага лісця; «къавурма» – жаркое з мясам і чарнаслівам; «имам-балды» – соўс з баклажанаў, абсмажаных з іншай гароднінай і травамі.

Адметныя малочныя стравы: «къаймак» – плеўка, адмысловым спосабам прыгатаваная з малака, «къашкъавал» – сыр авечы; салодкія стравы: «балы-бадем» – маленькія піражкі з мёдам і арэхамі, «акъалва» – белая халва з арэхамі, «хазар халвасы» – хазарская памінальная халва. Шырока вядомыя напоі: «буза» (махсыма) – хмяльны напой з проса, караімскія віна і «къошаф» – узвар з садавіны. Выдатная даследчыца караімскай кухні Э. І. Лебедзева адзначае, што сапраўдная караімская гаспадыня імкнулася пачаставаць смачнай ежай кожнага, хто ўваходзіў у

хату, бо лічылася, што гэта прыносіць шчасце сям'і. У гераічным эпасе «Гулюш-Тота» Д. Лопатто апісана, як па-майстэрску прыгатаваныя караімскія стравы дапамаглі звабіць, накарміць праціўніка і абараніць крэпасць [3, *22*].

Шматлікія звычаі, абрады караімаў сваімі каранямі зыходзяць у глыбокую даўніну. Некаторыя з іх захавалі сваё значэнне і цяпер, але, на жаль, сёння мы маем дакладныя звесткі толькі аб сямейна-бытавой абраднасці караімаў. Захаваўся песенны фальклор у выглядзе калыханак, а таксама малыя жанры фальклору, пераважна прыказкі, якія з цягам часу трансфармаваліся і сталі амаль што сапраўдна беларускімі: *«Жонка выдатная – муж апрануты прыстойна»*, *«Дрэнны кравец з сваёй кішэні дакладзе»*.

***Радзіны.*** Немаўляці дарылі сырое яйка, купалі першы раз ў салёнай вадзе, галаву мылі жаўтком. Маці і дзіцё асабліва засцерагалі 40 дзён пасля родаў (тое ж ва ўзбекаў, казахаў, кіргізаў). Асаблівае месца адводзілі драўлянай калысцы, акружанай арэолам забабонаў. На восьмы дзень пасля нараджэння хлопчыка святкавалі абразанне, якое ўвасабляла прыняцце веры па Старым запавеце. Абрад вядомы таксама ў мусульман і іўдзеяў, захаваўся ў асобных хрысціянскіх суполках. У гэты дзень газзан даваў імя хлопчыку. Пры адсутнасці ў сяле газзана абрад праводзіў мула. За святочны стол садзіліся мужчыны, пасля іх – жанчыны. У наш час абрад знік.

З’яўленне дзяўчынкі святкавалі праз 14 дзён пасля нараджэння. Газзан даваў ёй імя, пасля чаго садзіліся за трапезу. Па старажытным павер’і немаўля не пакідалі надоўга без імені, і да афіцыйнага абраду, калі газзан павінен яго даць, ужо звалі этнічным імем або мянушкай. Адгэтуль дваістасць імёнаў. Для выратавання цяжка хворага дзіцяці сваякі або сябры «куплялі» яго і давалі новае імя, каб падмануць злога духа. Пасля адужання дзіця заставалася ў сям'і з новым імем. «Тыя хто набылі» таксама лічыліся бацькамі і ўдзельнічалі ў далейшым яго лёсе.

***Вяселле.*** Для яго патрабаваліся паўналецце, узаемазгода, агульнаэтнічнасць, адсутнасць забароненага сваяцтва. Стараліся браць шлюб з прадстаўнікамі далёкіх родаў. У мінулым дазвалялася жаніцца з блізкімі па крыві цюркскімі плямёнамі пры ўмове прыняцця імі караімскай веры. Дазвалялася шматжонства, але да XX ст. яно стала рэдкім.

Пачыналася вяселле заручынамі (пасля чаго нявеста не магла прамаўляць імя жаніха), папярэднімі падарункамі – *«хонжа»* і вечарам кройкі пасагу ў хаце нявесты. Вяселле *«той»* доўжылася сем дзён і ўключала дзявочы вечар у хаце нявесты і халасцяцкую гулянку ў жаніха; купанне нявесты, наведванне лазні жаніхом; складанне шлюбнай дамовы; апрананне нявесты і жаніха, шлюб. Жаніх з сябрамі галілі галовы. Нявесце фарбавалі хной валасы і пазногці, выкладвалі локаны – *«зилиф»*, якія адрознівалі жонку ад маладзіцы і ўдавы. Абрады суправаджалі музыка, песні, пачастунак, збор сродкаў для бедных. На сёмы дзень пасля шлюбу, у вечар падарункаў, малады муж цалаваў матцы руку і дарыў ёй футра. У выездзе жаніха ў лазню на конях, вяртанні баявым строем са стралянінай і скокамі бачны водгаласы

абраду выкрадання нявесты. У шлюбнай цырымоніі выкарыстоўвалі белы войлак або шкуру (як і кумыкі, кызыльцы, баяты; у беларускай традыцыі кажух, вывернуты поўсцю наверх, – сімвал плоднасці і багацця). У наш час вяселле караімаў спрасцілася. Захаваўся звычай ставіць маладых на шкуру і пасыпаць манетамі і збожжам. Амаль згублена рэлігійная абраднасць.

***Пахаванне.*** Хавалі ў драўлянай труне з рукамі, выцягнутымі ўздоўж цела. Прытрымліваючыся выразу «*як прыйшоў у целе, так прыйдзецца і сыйсці*», у труну не клалі каштоўнасцяў – гэтая адметнасць істотна адрознівае звычаі караімаў ад хазар, якія складвалі ў надмагільныя курганы вялікую колькасць каштоўнасцей. На нашу думку, у гэтым прасочваецца пераход да хрысціянізацыі караімаў. Уначы ля труны гарэлі свечкі. Адпявалі пры зачыненай труне. Блізкія не дакраналіся да нябожчыка. У хаце і на могілках газзан выконваў жалобныя песні *«кына»* і памінальную малітву на роднай мове. Усе былі з пакрытымі галовамі. Магіла была арыентавана з поўначы на поўдзень. Па баках яе забівалі калы – *«къазык»*, аналогію чаму знаходзім у іншых цюркскіх і мангольскіх народаў. У дзень пахавання і пры наступным наведванні нябожчыка на магілу, уногі, клалі каменьчыкі (іўдзейская традыцыя). На памінках мужчыны і жанчыны сядзелі асобна. Самыя блізкія ў трапезе не ўдзельнічалі, а пасля сыходу гасцей здзяйснялі абрад *«айакъ- ичмэк»* (піць з кубка) і апускаліся ў глыбокую жалобу. На чорныя лямец або шкуру станавіўся газзан, вакол па ступені сваяцтва па руху сонца размяшчаліся астатнія. Пасля блаславення ўсіх прысутных абыходзілі па руху сонца кубак з віном і хлеб. Сем дзён не елі мяса і нічога не выносілі з хаты. Паўторны абрад на чорным лямцу завяршаў глыбокую жалобу. За ім ішоў абрад *«эт-аши»* (мясная страва) і дазвалялася паўсядзённая ежа. На 40-ы дзень падавалася хазарская халва суцяшэння. Праз 11 месяцаў жалоба заканчвалася апошнімі памінкамі з белай халвой. Пахаваным на чужыне ставілі безмагільны помнік – *«йолджи-таш»* (камень падарожніку). Старажытны звычай загадваў караімам (як і хазарам) сыйсці з каня ля магіл правіцеляў у знак глыбокай пашаны да іх памяці.

Сёння караімы імкнуцца да адраджэння нацыянальнай самасвядомасці. І як запісана ў «Караімскай народнай энцыклапедыі», «будучыня караімаў залежыць ад таго, ці змогуць яны расказаць сваім дзецям, кім былі іх продкі, нагадаць імёны некаторых герояў войнаў з іх плямёнаў, распавесці аб людзях, якія праславіліся ў мінулым і сучаснасці, а галоўнае, растлумачыць іх веру і этнічнае паходжанне...»

## ЛІТАРАТУРА

1. *Алексеев В*. Караимы и Москва. Москва, 1997.

2. Караи (крымские караимы). История, культура, святыни. Симферополь, 2000.

3. *Лебедева Э. И.* Рецепты караимской кухни. Симферополь, 1992.

4. *Полканов Ю. А.* Караи-крымские караимы-тюрки: История. Этнография. Культура. Симферополь, 1997.

5. *Шапшал С. М.* Караимы СССР в отношении этническом. Караимы на службе у крымских ханов. Симферополь, 2004.

6. http://www.vilnius.skynet.lt/

7. http://legendy.narod.ru/etnos/obrydykaraimov.htm